Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Гэты тыдзень падорыць новыя сілы для дасягнення пастаўленых мэт. Зрэшты, на працы пануе летняя расслабленасць. Так што асаблівага прасоўвання ў справах не чакайце. Лепш заняцца асабістым жыццём і ўмацаваннем адносін у сям'і, прычым на гэта не давядзецца затрачваць шмат намаганняў. У пятніцу паездкі і навіны не прынясуць чаканых вынікаў, лепш прысвяціць гэты дзень звычайнай працы. У суботу пажадана не ўступаць у канфлікт з навакольнымі адкрыта, згаджайцеся і працягвайце спакойна рабіць усё па-свойму.

ЦЯЛЕЦ. Для вас надыходзіць спрыяльны тыдзень. Даверцеся інтуіцыі — яна падкажа, хто вам сябар, а хто вораг. Аўторак — спрыяльны дзень для пачатку доўгатэрміновых праектаў. Выдатна пойдуць справы, звязаныя са страхаваннем і спадчынай. Прыкладзіце больш намаганняў для пошуку дадатковага заробку. Паклапаціцеся аб павышэнні ўзроўню кваліфікацыі. Вас могуць парадаваць весткі здалёку. Магчыма, дзеці запатрабуюць больш часу і ўвагі.

БЛІЗНЯТЫ. Добры тыдзень для тых, хто прывык працаваць з душой і з рызыкай. Можна разлічваць на поспех і прыбытак. У аўторак можна планаваць доўгатэрміновыя мерапрыемствы і завяршаць ужо пачатыя справы. У канцы тыдня вас чакаюць новыя прыемныя знаёмствы і актыўнае свецкае жыццё. Выхадныя пройдуць у атмасферы рамантыкі і кахання.

РАК. Тыдзень спрыяльны для творчай актыўнасці. Час няўдач застаўся ззаду. Можна радавацца і дзейнічаць, тым больш што вас перапаўняе творчая энергія. Пашырце свае гарызонты, навучыцеся чаму-небудзь новаму. Каханы чалавек парадуе вас увагай і клопатам. Аднак выбраны вамі напрамак можа з лёгкасцю змяніцца на супрацьлеглы, сачыце за сабой.

ЛЕЎ. Вашы жаданні і рэальныя дзеянні могуць прыйсці ў пэўны дысананс. Можа падацца, што навакольныя вас проста выкарыстоўваюць, нічога не даючы наўзамен. Хутчэй за ўсё, гэта не зусім так, таму не варта ўголас выказвацца з гэтай нагоды. Давядзецца ўціхамірыць самалюбства і падпарадкавацца сітуацыі. Зараз не час змагацца. Магчымыя сваркі з блізкімі людзьмі, паспрабуйце своечасова спыніцца.

ДЗЕВА. Варта дзейнічаць рашуча, увасабляючы ў жыццё свае планы і задумы, але пры гэтым пажадана заручыцца падтрымкай калег. Не ўспрымайце ўсур'ёз плёткі і чуткі, бо інфармацыя, якая да вас дайшла, будзе вельмі скажоная. У чацвер ёсць рызыка дапусціць прыкрую памылку. У пятніцу могуць спатрэбіцца такія якасці, як дысцыплінаванасць і пунктуальнасць, тады вы паспяхова справіцеся з многімі складанымі задачамі.

ШАЛІ. Выберыце галоўную задачу тыдня і ўважліва прадумайце стратэгію яе рашэння. Ваша старанасць на працы, вядома, вельмі пахвальная, але здароўе даражэйшае. Паспрабуйце не перанапружвацца. Самы час падумаць пра адпачынак. Плануючы нешта новае, не забывайце пра незавершаныя справы. Субота можа аказацца паспяховым днём, правядзіце яго ў прыемнай кампаніі.

СКАРПІЁН. На гэтым тыдні будуць удалыя паездкі і адпачынак на прыродзе. Прычым вы не выдаткуеце на яго шмат. Да таго ж у сераду зоркі абяцаюць дадатковы заробак. Пацешце сябе, гэта дадасць пазітыву і энергіі і зробіць вашы адносіны са светам больш гарманічнымі.

СТРАЛЕЦ. На гэтым тыдні вы здольныя разабрацца ў многіх заблытаных рэчах, выявіўшы хвосцік вялікага клубка даўніх праблем. Галоўнае — не выпусціць яго. У аўторак ці сераду магчымы доўгачаканая грашовая паступленні. У чацвер вас могуць заваліць дробныя, але тэрміновыя справы. У пятніцу з'явіцца прапанова, якая станоўча паўплывае на ваш дабрабыт. Увогуле, будзеце занятыя і запатрабаваныя.

КАЗЯРОГ. Тыдзень можа аказацца даволі клапотным, магчымыя скажэнні інфармацыі, якая паступае, як па вашай віне, так і па злосным намеры тых, з кім давядзецца мець зносіны. Надыходзіць час змен на працы, і вам неабходна падрыхтавацца да новых задач, якія паставіць начальства. Гэта час, калі варта развітвацца з састарэлым — няхай гэта будуць рэчы або адносіны. Нельга губляць каштоўнага часу, выявіце максімум працавітасці.



ВАДАЛІЎ. На гэтым тыдні ўдзяляйце асаблівую ўвагу стасункам з патрэбнымі і ўплывовымі людзьмі. Можа парадаваць нечаканае прызнанне вашых прафесійных заслуг. Панядзелак — удалы дзень, каб выступіць з прамовай, умацаваць свой аўтарытэт сярод калег. У чацвер і пятніцу ўпэўненасць ва ўласных сілах зробіць усё за вас. У нядзелю варта перагледзець сваю стратэгію адносін са сваякамі, у першую чаргу — з дзецьмі.

РЫБЫ. Зараз вам лепш расслабіцца і адпачыць. Яшчэ не прыйшоў час для рэалізацыі доўгатэрміновых планаў. Будзьце гатовыя да любых сюрпрызаў у асабістым жыцці. Адносіны могуць змяніцца, з кімсьці вы расстанецеся, але не засмучайцеся: на іх месца прыйдуць новыя людзі, якія вас не расчаруюць. Вакол лунае мноства ідэй, не палянуйцеся іх сфармуляваць і абдумаць, варта толькі засяродзіцца — і ўсё атрымаецца.

Даты Падзеі Людзі

10 ЖНІЎНЯ

1878 год — нарадзіўся Міровіч (сапр. Дунаеў) Еўсцігней Афінагенавіч, беларускі рэжысёр, драматург і педагог, адзін з заснавальнікаў беларускага сучаснага тэатра, народны артыст Беларусі, прафесар. Творчую дзейнасць пачаў у 1900 годзе ў Пецярбургу як акцёр і рэжысёр. З 1919 года — акцёр і рэжысёр Мінскага гарнізоннага тэатра. Адзін са стваральнікаў БДТ-1 (цяпер — Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы), у 1921—1931-м яго мастацкі кіраўнік, у 1941—1945-м — рэжысёр. З 1945 года — мастацкі кіраўнік і загадчык кафедры майстэрства акцёра Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Паставіў спектаклі: «На Купалле» М. Чарота, «Мешчанін у дваранах» Мальера, «Даходнае месца» А. Астроўскага. Памёр у 1952 годзе. Пра жыццё і дзейнасць Еўсцігнея Міровіча зняты дакументальны фільм «Праз усё жыццё».

1920 год — у Мінску адкрыўся Беларускі трэці дзяржаўны тэатр (з 1932 года — БДТ-3), які працаваў да 1937 года і ў розны час меў назвы: Трупа беларускіх артыстаў пад кіраўніцтвам У. Галубка, Другая беларуская дзяржаўная трупа, Беларускі дзяржаўны перасоўны тэатр. Уладзіслаў Галубок — першы народны артыст Беларусі (1928) — стварыў глыбока самабытны тэатр у адпаведнасці з традыцыямі беларускага народнага сцэнічнага мастацтва.

1958 год — закладзены горад Салігорск. Першапачатковая назва — пасёлак Новастаробінск. Узводзіўся на месцы вёскі Вішнёўка ў сувязі з будаўніцтвам першых у Беларусі калійных камбінатаў. У 1963 годзе атрымаў статус горада, з 1965-га — цэнтр Салігорскага раёна.

1675 год — у прадмесці Лондана была закладзена Грынвіцкая каралеўская астранамічная абсерваторыя (заснавана каралём Карлам II 22 чэрвеня 1675 года). Праз абсерваторыю праведзены «нулявы мерыдыян», з якога пачынаецца адлік гадзінных паясоў на планеце.

1865 год — нарадзіўся Аляксандр Канстанцінавіч Глазуноў, рускі кампазітар, дырыжор, музычна-грамадскі дзеяч, народны артыст РСФСР. Найбольш плённа працаваў у жанрах сімфанічнай музыкі. Сярод твораў: балеты «Раймонда», «Поры года», кантаты, 8 сімфоній, 5 уверцюр, сімфанічная паэма «Сцяпан Разін», рамансы і песні, музыка да драматычных спектакляў. Памёр у 1936 годзе.

1897 год — германскі хімік Фелікс Хофман упершыню ў гісторыі фармакалогіі сінтэзаваў хімічна чыстую ацэтылсаліцылавую кіслату, вядомую цяпер пад назвай аспірын.

1912 год — нарадзіўся Жоржы Амаду, бразільскі пісьменнік, класік лацінаамерыканскай літаратуры, член Бразільскай акадэміі. Аўтар раманаў «Капітаны пяску», «Дона Флор і два яе мужы», «Тэрэза Батыста, якая стамілася ваяваць», «Луіс Карлас Прэстэс» і іншых. Памёр у 2001 годзе.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.39	20.50	15.11
Віцебск —	5.24	20.44	15.20
Магілёў —	5.29	20.40	15.11
Гомель —	5.31	20.31	15.00
Гродна —	5.55	21.05	15.10
Брэст —	6.01	21.00	14.59

Месяц

Апошняя квадра 4 жніўня.

Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Алены, Анастасіі, Васіля, Івана, Майсея, Ніканора, Прохара, Юльяна.*

К. *Багдана, Барыса, Ваўжынца.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

У кожным офісе ёсць цётка, якая нават у 32-градусную спякоту выключае кандыцыянер са словамі «мне холадна», а на прапанову надзець кофтачку заяўляе:

— Я што, дурніца летам у кофтачцы сядзець?!

Колькі мужа ні кармі, на наступны дзень ён як быццам і не еў зусім.

— Божухна! Што гэта ў вас такое на шыі?

— А, гэта Алёшка, сынок наш. Яму 24 хутка.

Грыбнік Мікалай, убачыўшы мядзведзя, які падыходзіў, праз імгненне ўсвядоміў, што хвойныя галінкі б'юць па твары значна больш балюча, чым бярозавыя...

— Я цяжарная.

— З чаго ты ўзяла?

— Мяне ванітуе ад працы і цягне да салёнага мора.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zviazda.by, (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2983. Нумар падпісаны ў 19.30 9 жніўня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12